# ЮБІЛЕЙНЫЯ ДАТЫ

## МІКАЛАЙ ГУСОЎСКІ – ПАЭТ, ГУМАНІСТ І АСВЕТНІК ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ

### (ДА 525-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)

У 2005 годзе знакамітаму славянскаму паэту і гуманісту-асветніку Беларусі Мікалаю Гусоўскаму спаўняецца 525 год з дня нараджэння.

Жыццё і творчасць вядомага творцы слова і філосафа прыпадае на цудоўную эпоху развіцця грамадства і чалавецтва ў Еўропе – эпоху, якую прынята называць Адраджэннем. І сапраўды гэта быў час, калі нараджаліся таленты ў розных галінах мастацтва, літаратуры, навукі, калі абуджалася цікавасць да чалавека і яго светаўспрымання, прыроды, ведаў, навукі, мастацтва, грамадства, калі нараджалася свабодная думка і мысленне.

Увогуле, эпоха Адраджэння (Рэнесанс) характарызавалася развіццём духоўнай культуры, уздымам свецкай навукі, мастацтва, станаўленнем нацыянальнай мовы, літаратуры, нацыянальнай самасвядомасці, гуманістычнага светапогляду. Рэнесансны гуманізм сцвярджаў моц і свабоду творчага чалавечага духу.

Для Беларусі, як адзначае С.А. Падокшын, такой "вызначальнай эпохай" у пэўным сэнсе з' яўляецца перыяд першага беларускага Адраджэння (XVI – пачатак XVII ст.). Менавіта ў гэтую эпоху сфарміраваліся каштоўнасці і ідэалы, якія складаюць аснову сучаснай духоўнасці і нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа [6, с. 93].

Адным з істотных момантаў Адраджэння на Беларусі з'яўляецца станаўленне нацыянальнай, уласна беларускай культуры. Рэнесансавая ідэя служэння агульнаму дабру набыла ў Беларусі нацыянальна-патрыятычную і асветніцка-дэмакратычную канкрэтызацыю [6, с. 75].

Гуманізм эпохі Адраджэння і Рэфармацыі на Беларусі характарызаваўся не толькі дэмакратычным характарам і выхаваўча-асветніцкай накіраванасцю, але і цэласнасцю светаўспрымання, цеснай сувяззю з прыродай, аптымізмам, сцвярджэннем фізічнай і духоўнай магутнасці чалавека, імкненнем да прыгожага і справядлівага. Гуманізм даў Беларусі сваіх высокаадукаваных вучоных, паэтаў, дзяржаўных і царкоўных дзеячоў: Ф. Скарыну, М. Гусоўскага, С. Буднага, В. Цяпінскага і інш. Айчынныя гуманісты-асветнікі развівалі ідэі аб высокай годнасці чалавека і яго інтэлектуальных здольнасцях, аб неабходнасці ўдасканалення грамадства і асобы, аб узмацненні нацыянальна-патрыятычнага пачатку ў выхаванні, аб адукацыі і духоўным развіцці народа. Гэтыя ідэі абазначыліся ў літаратурна-грамадскім жыцці Беларусі на пачатак XVI стагоддзя.

Адным з яркіх прадстаўнікоў Адраджэння Беларусі быў М. Гусоўскі, які не толькі развіваў вышэйназваныя ідэі ў сваёй паэтычнай творчасці, але і першым прапагандаваў нацыянальную культуру, прыроду, традыцыі, характар беларускага народа. М. Гусоўскі быў таленавітым паэтам свайго часу і верным сынам сваёй Айчыны. Безумоўна, рэнесансны гуманізм дазволіў раскрыцца таленту вялікага ўсходнеславянскага паэта-беларуса.

Біяграфічныя звесткі пра Міколу Гусоўскага нешматлікія. Нарадзіўся ў сям'і лесніка – паляўнічага. Дзе і калі – невядома. Навукоўцы, гісторыкі, літаратары называюць дату нараджэння прыкладна каля 1480 года. Дзяцінства Мікалая прайшло дзесьці на беразе Дняпра. Звернемся да твора:

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Рэкі лясныя, Дняпра паўнаводнага строму
Пераплываў я з канём у пагоні за зверам.

Даследчыкі яго творчасці (Я. Пельчар, Ю. Кжыжаноўскі, Ю. Каленбах, Е. Крукоўскі і інш.) сыходзяцца на тым, што дзяцінства будучага паэта прайшло ў пушчах Дняпра і Нёмана. Відавочным з'яўляецца той факт, што менавіта беларуская зямля ўзрасціла гэтага слыннага творцу навалацінскай паэзіі і цудоўнага прадстаўніка айчыннай культуры. Пазней, як бы ў знак удзячнасці свайму народу ён сваёй бессмяротнай паэмай "Песняй пра зубра" праславіць не толькі ўласнае імя, але і тую краіну, якая нарадзіла яго, нашу Беларусь.

Выхаванне наш знакаміты суайчыннік атрымаў спачатку дома ад бацькі. Вось як ён пісаў аб гэтым у сваёй паэме:

Змалку ад бацькі вучыўся ў бясконцых абходах
Крокам нячутным ступаць, каб нішто не штурхнула,
І спасцігаў, як звяроў прыкмячаць па бярлогах
Нюхам, і вухам, і вокам. Без якасцей гэтых
Не напалюеш, бо звер палахлівы і пільны...
У пушчах, пакуль мяне, сына, вучыў палясоўшчык!
...Быў і адважны, а дзе й неразважны, казалі:
Як ні было – не забыць сваю школу Міколу.

Як бачым, і дзіцячыя, і юнацкія гады жыцця Міколы звязаны з лукам, канём, паляваннем. Школу прыроды, якую ў юнацтве прайшоў сам паэт, лічыў неабходнай з'явай у жыцці і станаўленні юнака-паляўнічага. Але не толькі гэтая школа гартавала Міколу. Звернемся да яго паэмы:

Свет даўніны вывучаў я па кнігах славянскіх,
Граматах рускіх, кірыліцай пісаных вязкай.

Відаць, першая кніжная школа была царкоўна-прыходскай або кафедральнай. Толькі там можна было атрымаць першапачатковую адукацыю. Потым была еўрапейская адукацыя – "сем свабодных навук". Усе даследчыкі ягонай паэзіі адзначаюць, што М. Гусоўскі быў вельмі адукаваным і рознабакова развітым чалавекам. Ён добра ведаў старажытныя і тагачасныя мовы, антычную філасофію і паэзію, свяшчэннае пісанне. Разнастайны яго веды ў палітыцы, гісторыі, дыпламатыі. Яго хвалявалі філасофскія, сацыяльныя праблемы, асабліва праблема суадносін і гармоніі чалавека, прыроды і грамадства.

У жыцці М. Гусоўскага, яго лёсе вялікую ролю адыграў пратэктар Эразм Вітэліус – сакратар велікакняскай канцылярыі, епіскап плоцкі: у сваё трэцяе польска-літоўскае дыпламатычна-пасольскае падарожжа ў Рым ён запрасіў М. Гусоўскага. У якасці сакратара М. Гусоўскі правёў амаль пяць гадоў. Гэты перыяд аказаўся самым плённым для беларускага творцы. Знаходжанне паэта ў самым цэнтры элітарнага італьянскага Адраджэння, знаёмства з папай Львом Х Медзічы, актыўным дзеячам і апякуном Адраджэння, паэтычнай і мастацкай творчасцю іншых прадстаўнікоў гэтага руху, безумоўна аказала вялікі ўплыў на творчасць Гусоўскага. За час праведзены ў Рыме (1518 – 1523) канчаткова сфарміраваўся ягоны светапогляд, які вылучаўся рэнесансным гуманізмам і патрыятызмам.

Выконваючы заказ Вітэліуса для папы Льва Х Медзічы, паэт стварыў у 1522 годзе шэдэўр славянскай культуры – "Песню пра зубра". У 1523 годзе кніга пад назвай "Песня Мікалая Гусоўскага пра постаць, лютасць зубра і паляванне на яго" [5, с. 35] была надрукавана ў Кракаве ў друкарні Гіераніма Вістара. У паэме, якую напісаў за мяжой, М. Гусоўскі выступіў як асоба творчая і таленавітая, як патрыёт сваёй радзімы і асветнік-гуманіст. Паэт з пачуццём гонару, задавальнення і хвалявання, распавядае заходнееўрапейскаму чытачу пра цудоўную і прыгожую сваёй прыродай і людзьмі краіну Беларусь. Паэма была першай песняй пра Беларусь.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Выдатны літаратурны твор-паэма “Песня пра зубра” – напісаны аўтарам лацініцай – тагачанай міжнароднай мовай навукі, літаратуры, дыпламатыі. Трэба адзначыць, што агульны характар адукацыі ў ВКЛ знаходзіўся ў першай палове XVI ст. пераважна пад лацінскім уплывам. Вучоба беларускай моладзі ва універсітэтах Еўропы, дзе выкладанне вялося на латыні, у многім вызначала не толькі светапогляд маладых людзей, але і ўзнікненне беларускай літаратуры на лацінскай мове.

М. Гусоўскі пісаў свае творы як да паездкі ў Рым, так і апасля. Ім былі напісаны вершы “Да святога Себастыяна”, “На ахвяравальніцтва чорнага быка”, “Малітва да святой Ганны”, паэмы “Перамога над туркамі”, “Жыццё і подзвігі святога Гіяцынта”. Апошні верш “Павучанне пастырам” быў напісаны ў 1533 годзе, у канцы жыцця М. Гусоўскага.

Славу і вядомасць паэту прынесла, безумоўна, паэма “Песня пра зубра”. Аб чым гэты твор? Па назве – аб пушчанскім прыгажуне зубры, яго моцы і сіле, прыродзе і паляванні. Хоць наконт зубра ў апошні час з’явіліся сумненні. Так, рэдактар расійскага часопіса “Наш современник” С. Куняеў, перакладчык паэмы “Песня пра зубра” на рускую мову (2004 г.), піша : “не о зубре, а скорее всего о легендарном туре рассказывает нам Гуссовский” [3, с. 56]. Але гэтыя акалічнасці ніколькі не зніжаюць каштоўнасці паэмы. Ды і не ў гэтым справа. Калі глыбей учытваешся ў радкі паэмы, то бачыш, што не толькі пра прыроду і паляванне піша паэт. Гэта паэма аб тагачасным грамадстве, у якім жыў М. Гусоўскі, яго праблемах і надзеях, а дакладней, аб станаўленні і гісторыі ВКЛ. Зубр – алегорыя Радзімы, яе народа, яе прыроды, яе магутнасці. Даная паэма пра нашу родную Беларусь, пра нашу цудоўную прыроду, пра багаты лясны край і жывёльны свет, пра характар душы беларуса. Несумненна, паэма “Песня пра зубра” гэта паэма нацыянальнага і асабістага лёсу аўтара. Даследчык гістарычнага мінулага Беларусі, прафесар А. Лойка назваў яе “ біяграфічнай паэмай”, “паэмай жыцця паэта” [4, с. 238-239]. І разам з тым, – гэта творчасць эпохі Рэнесансу, праз якую славянскі паэт ставіць актуальныя пытанні і праблемы тагачаснасці і такім чынам праз паэзію ўдзельнічае ў іх вырашэнні. “Песня пра зубра” – твор высокага духоўнага зместу, аснову якога складаюць гуманістычны рэнесансны падыход і пры сутнасць асабістага “Я”.

Упершыню беларусы змаглі пазнаёміцца з гэтай неўміручай паэмай толькі ў другой палове XX стагоддзя, калі ў 1968 г. з’явіўся яе пераклад на рускую мову Я. Парэцкім і Я. Семяжонам. На беларускую мову паэма была перакладзена Я. Семяжонам у 1969 г. А ў 1980 г. у год 500-годдзя з дня нараджэння паэта “Песня пра зубра” была надрукавана асобай кніжкай на лацінскай, беларускай і рускай мовах у перакладзе Я. Семяжона. Пазней, паэму пераклалі на родную мову У. Шатон у 1994 г. і Н. Арсеннева. Яе пераклад быў надрукаваны ў 1997г. І самы апошні пераклад паэмы на рускую мову для шырокага расійскага чытача быў зроблены і надрукаваны ў мінулым годзе С. Куняевым.

Такім чынам, цікавасць да паэтычнай творчасці М. Гусоўскага на Беларусі, ды і ў свеце, узрастае. Яго творчасць даследуюць філосафы, паэты, літаратары, гісторыкі, педагогі – В. Дарашкевіч, Э. Дарашэвіч, У. Калеснік, У. Конан, А. Лойка, А. Мальдзіс, Ж. Некрашэвіч-Кароткая, С. Падокшын, Я. Парэцкі, В. Чамярыцкі, В. Шалькевіч і інш. І гэта невыпадкова, у творах гэтага мысліцеля змястоўна прагучалі філасофскія, сацыяльна-палітычныя, рэлігійныя і асветніцка-гуманістычныя ідэі, якія і сёння не страцілі сваёй актуальнасці: гармонія прыроды і чалавека, чалавека і грамадства, мірнае суіснаванне народаў, ідэя яднання і дружбы, цывілізацыя і экалогія, асоба і сусвет, адукацыя і прагрэс грамадства і інш. У паэме М Гусоўскі раскрывае свае педагагічна-асветніцкія погляды на выхаванне,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

асобу чалавека, на сістэму адукацыі. У яго “Песні пра зубра” дзівосным вобразам узаемазвязаны і непарыўны ўсе ідэі паэмы.

Самая галоўная ідэя паэмы – ідэя патрыятызму. Лёс радзімы, адданасць роднай зямлі, любоў да роднага краю і клопат за сваю Айчыну было пранесена паэтам-лаціністам праз увесь змест паэмы. У яго Радзіма, гэта беларускі працавіты народ, гэта багатая прырода, гэта мудры і справядлівы князь Вітаўт, гэта нацыянальныя традыцыі, гэта хрысціянскія запаведзі, гэта незлічоная веліч жывёльнага і раслiннага багацця, гэта ўсё жывое, што патрабуе любові, захавання і абароны ў межах дзяржавы, так і сусвеце ў цэлым.

З вялікай любоўю і майстэрствам М. Гусоўскі апявае родны край, яго прыгажосць і багацце:

Вымушан скласці свой спеў аб краіне з багаццем
Свету жывёльнага ў ёй, бо і звер гэты цудам
Толькі шчэ ў нас захаваўся пад зоркай Палярнай
Край мой...
Я перамераў удоўжкі і ўпоперак пешшу.
..........
Скарбы свае нашы людзі, на золата нават
Не прамяняюць. Здаўна іх жыццё навучыла:
Нашы лясы – гэта нашых даброт і багацця
Невычарпальны калодзеж...
Край наш прырода такім надзяліла багаццем,
Што незлічонасць у пушчы дзічыны і звера...
Нашы лясы –гэта наша скарбонка і свіран,
Наша камора жывіцы, і дзёгцю, і ягад,
Мёду і воску, куніцы і рознай дзічыны.

Патрыёт і гуманіст клапоціцца аб будучыне сваёй Радзімы, аб яе лёсе, ён заклікае да яднання розныя па веравызнанні і культуры еўрапейскія народы супраць нашэсця турак і татар:

... гора радзімы
нават цяжэйшае. Дзе нам знайсці тыя лекі,
...каб ратаваць яе ў бедах.
Без падтрымкі , бясконца
Войны вядзем мы адзін на адзін за свяшчэнны
Братні саюз хрысціянства з навалай з усходу...
Час схамянуцца! Няхай яшчэ сёння грымоты
Дзесь за гарамі адгэтуль, а поступ нашэсця
Смерці падобны: стыхію не спыніш заклёнам...
Што запяем ты, сусед наш, калі скалануцца
Плачам і стогнам твае гарады і мястэчкі?
... дык хай жа пачуецца ў свеце
Гусаўца голас між волатаў нашых пушчанскіх.

У паэме аўтар гучна выступіў супраць войн:

Войны! Злачынная справа – вайна выклікае
Гнеў мой, і слёзы і боль...
Спынім забойствы!

М. Гусоўскі праўдзіва паказаў тагачаснае становішча сваёй радзімы, аслабленай як бесперапыннымі войнамі, так і княскімі ўсобіцамі. Ён выступіў з рэзкай крытыкай палітыкі правіцелей еўрапейскіх дзяржаў за іх прагнасць да ўлады,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

да багацця, за тое, што яны вядуць міжусобныя, братазабойныя войны, у якіх гінуць простыя людзі, народы:

Гонар, сумленне зямных уладарцаў, здаецца,
Спяць беспрабудна.Усе іх учынкі і справы
Людзям на гора, дзяржаве ж - на шкоду і страты.
Болей за ўсё непакоіць іх сверб панавання...
Вострыць мячы пастаянна сусед на суседа –
Ты або я запаную, двaім жа нам цесна.
Братазабойствы, грызня, міжусобныя войны...

М. Гусоўскі філосаф сярэднявечча і новага часу, паэт-гуманіст і разам з тым вельмі моцная асоба. Як патрыёт сваёй Радзімы, як чалавек веруючы, ён звяртаецца з малітвай да Маці Боскай каб спыніць усобіцы:

Боская Маці, прачыстая Дзева Марыя...
Вымаліць краю Тваю абарону-спагаду.
О, заступіся за нас!

У гэтым закліку-малітве не толькі душа паэта, яго майстэрства, але і яго вера ў магутнейшы сродак Любоў і Справядлівасць. Паэма заканчваецца зваротам Гусоўскага да Боскай Маці, як да найвышэйшай інстанцыі, на якую спадзяецца. М. Гусоўскі адным з першых у Еўропе абгрунтаваў ідэю мірнага суіснавання народаў, ідэю барацьбы за мір.

Аўтар паэмы паўстае перад намі як цудоўны знаўца і абаронца прыроды. Ён разумеў, што прырода – гэта ўсенародная ўласнасць, крыніца жыцця, радасці і выхавання. З вялікім хваляваннем і клопатам ён заклікае любіць, шанаваць, берагчы і захоўваць прыроду, разумна выкарыстоўваць яе багацці:

Лічаць, што рыцар пушчанскі адправіцца ўпрочкі
З тых запаветных урочышчаў, дзе ў паедынках
З ім сустракалася часта не дужасць, а хітрасць –
Будуць там пасткі, засады ці стрэлы з мушкетаў.

Такім чынам, М. Гусоўскі першы паставіў праблему аховы навакольнага асяроддзя, ашчадных адносін да скарбаў прыроды, рацыянальнага, гаспадарчага выкарыстання прыродных багаццяў, як бы мы сказалі зараз праблему экалогіі. М. Гусоўскі вельмі адказна і ўважліва ставіўся да пытанняў навукі, адукацыі, мастацтва. Гэты выдатны дзеяч Адраджэння і славянскай паэзіі прадбачліва разумеў, што навука, вучоны і таленавіты люд прыносяць магутнасць і багацце дзяржаве, як духоўнае так і матэрыяльнае: "Дзяржава абапіраецца больш на мужнасць духу, чым на сілу цела, пра што сведчаць як грэкі, так і рымляне. Іх магутнасць квітнела найбольш тады, калі расцвіталі навукі. А як толькі пачалі нікнуць таленты, сілы іх згаслі, а з заняпадам апошніх абрушылася іх дзяржава і ўсталявалася рабства. Таксама і ў нас" [2, с. 52].

Не адыходзячы ад традыцый духа паэтыкі Рэнесансу, М. Гусоўскі ў сваім прысвячэнні да "Песні пра зубра", адрасаваным каралеве Боне Сфорца, заклікае яе ўзяць на сябе дзяржаўнае апякунства і аказваць дапамогу таленавітым людзям навукі і мастацтва, адкрываць у дзяржаве школы, пашыраць навуку, берагчы культуру: "бачу я з найвялікшым для сябе жалем і, зразумела, з пэўнай стратай для дзяржавы, што славуцейшыя сэрцы зусім не паважаюцца. Яны з-за матэрыяльнай нястачы і беднасці цалкам не могуць сябе праявіць. Бачу я таксама, што ёсць нямала людзей, якія валодаюць і багаццем і талентам. Але калі яны заўважаюць, што вучоных, мастакоў і паэтаў так мала шануюць і паважаюць, то імкнуцца больш узбагачацца, чым ахарошваць душу. З-за такой нікчэмнай справы ахвяруюць яны самым высакародным прызначэннем сваіх асоб.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

А калі возьмеш ты на сябе агульнае апякунства над гэтымі захапленнямі, тады узбуйнеюць таленты і прынясуць карысць Каралеўскай Вялікасці ў яе значнай працы, так што дзяржава будзе зберагацца ў сваім стане ў гэты злавесны час" [2, с. 51].

"...Мне добра вядома, найсвятлейшая пані, якога вялікага шчасця ты зычыш гэтаму каралеўству і як шмат разважаеш і дбаеш аб паляпшэнні ягонага становішча... Калі ж ты праявіш сябе добразычлівай, схільнай да апякунства навукі і мастацтва, тады ад іх будзе і дзяржаве вялікая карысць, а высокая слава імя твайго распаўсюдзіцца такім чынам яшчэ вышэй з ухвалай тваіх (выхаванцаў)" [2, с. 52].

Услаўляючы дзейную, свабодную і мужную асобу, паэт заўсёды аддаваў перавагу такім якасцям чалавека, як справядлівасць, годнасць, духоўнасць. Такім у яго ўяўленні быў князь Вітаўт:

... Княжанне Вітаўта лічаць усе летапісцы
Росквітам княства Літоўскага, нашага краю,
І называюць той век залатым. Разбяромся:
Мне так здаецца, што гэтай шаноўнаю назвай
Век той названы па простай прычыне: дзяржаўца
Перад багаццем і шчасцем зямным пастаянна
Ставіў багацце духоўнае – злата дзяржавы.

Вялікі паэт быў першым беларусам, які загаварыў аб абуджэнні нацыянальнай свядомасці народа:

Мы – шчэ натоўп, грамада непісьменная, цемра...
Плаха і кат-выканаўца – вось доля любога,
Хто пастаяць за закон і за бога азваўся.

Асветнік і гуманіст шчыра верыў у свой народ, яго нацыянальную і чалавечую годнасць.

"Песня пра зубра" – гэта гімн бацькаўшчыне, мужнаму чалавеку, роднай прыродзе. М. Гусоўскі сваім творам паскорыў пашырэнне ідэй гуманізму як у літаратуры, так і ў педагогіцы, і культуры ў цэлым.

У сваёй паэме М. Гусоўскі звярнуўся да шматлікіх пытанняў, што і зараз з'яўляюцца актуальнымі: лёс радзімы, грамадзянскі патрыятызм, заклік жыць у міры, згодзе і дружбе, адносіны да прыроды, усведамленне нацыянальнай самасвядомасці народа, маральна-этычнае ўдасканальванне грамадства і асобы.

*ЛІТАРАТУРА*


1. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. / Ткачоў М.А. і інш.; Пад рэд. М.А. Лазарука і інш. – Мн.: Народная асвета, 1985. – 464 с.
2. ***Гусоўскі М.*** Песня пра зубра / Пер. на бел. мову Я. Семяжона. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1980. – 192 с.
3. ***Гуссовский Н.*** Песня о зубре / Вступительная статья и перевод поэмы с белорусского С. Куняева // Наш современник. – 2004. – № 12. – С. 54-71.
4. ***Лойка А.А.*** Старабеларуская літаратура: Падручнік / А.А. Лойка. – Мн.: Вышэйшая школа. 2001. – 319 с.
5. ***Некрашэвіч-Кароткая Ж.В.*** Мікалай Гусоўскі і яго паэтычны зборнік у беларускім літаратуразнаўстве // Веснік беларускага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 4: Філасофія. Журналістыка. Педагогіка. – 2002. – № 2. – С. 31-36.
6. ***Падокшын С.А.*** Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С.А. Падокшын. – Мн.: Бел. навука. 2003. – 316 с.


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова